БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29
Адміністрацыі Захарьуская
«Юбілейны Дом».

…кцыя адчынена ад 1 да 2 гадз.
пасьля поудня.
…ністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

…кцыя пакідзе за сабой права па…
…няць перасыланые рукапісы і ко…
рэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.,

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

…88. Менск. Субота 13 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Менская Меська Управа запрашае арэндатароу меська… зямлі, у каторых срокі кантрактау кончыліся да 1-го …опя 1918 г. адновіць іх на новых пацьверджаных Уп…ю умовах.

Член Управы **М. В. Запольскі-Доунар.**
Заведуючы зямельным аддзелам **Э. Полоневіч.**

Менск 13/VII.

Народная Дзяржава.

…§. 2 Дэкларацыі бела…го габінэта Р. Скірмунта …ена: «Стварэнне з Народ… Сэкратарыята Цэнтральнай …ы, каля якой навінны …авацца усе істнуючыя і …а створэнныя установы, … сама земство і гарады», …ра сот гадоу Беларусі …ло свае тутэйшай Ула… …каторая была бы косьць …сьці, кроу ад крыві па…гарадоу і весак, каторая …волю і усю думку пакі…а бы на падпяцце і раз… … Бацькаушчыны.

…ш край гэта ні будзе …лічная былая Расія, ка… … па своему каманд…ау …бург.

…стэма была імпэрыяліс…я. Акраіны заніскаліся …іцельна-паліцэйскай сыс…

…род быу толькі дзержау… …матэр'ялам, каторым ка…лі для сваіх цэнтралі…ых мэтау. Усе, што ішло … планоу пецярбурскіх …матау без літасці душы… … Беларускі край найбольш …мауся у сваім паступо…одзе, зрабіуся «запомня… …забраным краем». Аб гэ… …ужо много гаварылася і …ся і усім гэта вядома.

…ларусь уся падтрымаець …утэйшую, «нашу» Уласьць. …на Улада будзе сядзець …лскім Пецярбургу, а тут, …ым Менску. Яна на 700 … будзе бліжэй да народу. …е выбрана гаспадаром … самым арганізаваным …м.

… будзем гэтым самым ужо …йскай нівялікай дзержа… …ыгада невялікай дзержа… … Беларусь, тая, што тут …зін аднаго добра знаюць,—будзе як бы адна вялікая семья. Усе установы і канцэлярыі могуць легка катраліравацца і цэнтральнай Уладай і народам

Усе інтэрэсы і патрэбы краю будуць ведамы, усе нужды парода могуць быць залагоджэны.

Голас народа легка і скора дойдзе да нашай беларускай Улады. Яна будзе служыць народу, а ні народ ей. Народ сам будзя знаць свае дзержауныя павіннасьці. Спакойныя беларусы заусягды выпоунялі і будуць выпоунядь свае абавязкі адных грамадзян да другіх, і сваі абавязкі да Улады.

Зруйнованая вайной Беларусь можэ мець надзею толькі на свае сілы і на сваю уладу. Ніхто другі ні будзе плакаць над яе разарэннем. У усесьветнай ваеннай разрусе кожны народ дбаець толькі сам аб сваей шкуры.

З Пецярбургу і Масквы мы ні дачэкаемся помачы, там анархія і развал, канца каторым ні відаць Апіраючыся на Цэнтральныя дзержавы і на прыязныя нам дзержавы, як Украіна і усходня-палудзенныя Рэспублікі, Беларусь можэ выйсьці і выйдзе на шырокую дарогу матэрыяльнаго і духоунаго прагрэсу і свабоднаго грамадзянскаго развіцця Народнай Рэспублікі.

Агульныя вісткі.

ЖЭНЭВА, 8/VII. Нэнсі ужо у працягу двух дзён астаўся без хлеба. 2-го ліпня гаспадыні, прышоўшыя да булачных, нічога ні маглі купіць, дзеля таго, што яны аказаліся зачыненымі і на вітрынах былі зроблены надпісы: «Сягоння німа хлеба».

Забарона сплаўлення звонкай манэты.

Згодна весткам швэдскай газэты «Свэнска Дагбладэт» ад 25 чэрвеня, 22 чэрвеня у Швэцыі выдано распараджэнне, каторым забараняецца сплаўленне звонкай манэты і г. д.

РОТТЭРДАМ. Як паведамляюць, карабель «Роордам» пад павадырствам галяндзкіх ваенных караблёў уступіў у плаванне, прэрваннае нідаўна Англіяй у Нідэрляндскай Індыі. На прыказу Голляндскаго адміралтэйства, карабель «Роордам» зноў быў затрыманы на узвышшу Гэкван-Голянд і павінен быў стаць там на якор і чакаць дальнейшых загадаў. На караблі знаходзюцца 1.000 пасажыраў і троху галяндзкіх войск. Карабель «Бэнкаліс», належачы да гэтаго-ж канвою, ужо пакінуўшы Імуідэн, так сама атрымаў загад ураду вярнуцца у гавань як і карабель «Гэрзо Гэндрыкс», у той час, калі карабель «Тубанан» быў павядамлены оры адходу яго з гавані. Як здаецца, Англія задалася мэтай унізіць Галяндзію, даючы спачатку галяндскім ваенным караблям дазвол аб выездзі, дзеля таго, каб перад усім сьветам забараніць ім гэто у апошні момэнт.

РОТТЭРДАМ. Да амэрыканскаго войска Бонар Лоу [ангельскі міністр] між іншым сказаў, што Нямеччына можэ зьмірыцца хоць заутра з Амэрыкай, Францыяй і Англіяй, калі згодзіцца на варункі пададзяныя Амэрыканскім прэзыдэнтам Вільсонам.

РОТТЭРДАМ, 8 гм. Як паведамляюць з годнаго веры джэрэла, 5 гм. Японія была урадова апавешчэна, што ваенная рада коаліцыі развязуе Японіі рукі у Владывостоку і Сыбіру і што большэвікі мяркуюцца выслаць войско проці знайходзячыхся у Владывостоку Чэхаў і Словакаў. Японія высылае у Владывосток вялікі флот які прывезе новыя японскія войскі.

БЭРЛІН, 9 гм. «Вольф». Адстаўка ф. Кюльмана прызнаецца газэтамі ні ніспадзеванай. Наогул агульнае зданне што зьмен у палітыцэ ні будзе, бо гр. Гэртлінг астаецца канцлерам. Новаго міністра, адмірала Гінцэ вітае як правая прэсса, так роўне-ж і «Voss. Ztg» каторы адзначае, што адм. Гінцэ падтрымоўваў падводную вайну і абвесьціў, што Англія яўляецца душой процінямецкай коаліцыі.

ГААГА, 8 гм. «Вольф». У Португаліі пад кірункам рэвалюцыйных камітэтаў паўстала ж. д. забастоўка, каторая маець мэтай затрымаць жалезьнічны рух у ваўсім краі. Жалезьнікі нібыто хочуць забраць сталіцу з аружжэм у руках.

ВЕНА 9 гм. Газэты паведамляюць з добра паінформованых крыніц аб пачынаючыхся сягодня нямецка-аўстрыйска - вэнгерскіх гаспадарчых перагаворах у Зальцбургу, што конфэрэнцыя будзе мець харатэр толькі экономічны, і што ніводнае пытанне палітычнаго, ці ваеннаго характэру ні будзе разглядацца. Прапазыцыя Аўстро-Вэнгрыі ідзець да таго, каб стасункі паміж абоімі дзержавамі апіраліся ні на поўным скасаванні мыт, але каб усе важныя прадукты патрабуючыя ахранення падлегалі ахроннаму абмытаванню. Усе важныя прадукты, каторым пашкодзіў-бы вольны абмен паміж Аўстро-Вэнгрыяй і Нямеччынай павінны надлегаць азначанаму мыту; іншыя прадукты будуць увольнены ад мыта. Такім чынам, прэдбачна зьмешаная сыстэма: абложэнне мытом і увольненне ад мыта. Для прадуктаў землеробства прапануецца вольны рух. Далей сцьвярджаецца, што практаваная мытная сыстэма ні кіруецца проціў цяпер ніпрыяцельскіх дзержаваў, наадварот, яна мае быць так уложана, каб у сваім часе маглі быць зьвернуты прыязныя стасункі. Наагул мае быць забезпэчэна свабода у гандлёво-палітычным сэнсі на выпадак гандлёвай умовы з якой нібудзь іншай дзержавы. У прыязным паразуменні Аўстро-Вэнгрыі з Нямеччынай сьціскло засьцерагаецца свабода чыннасьці. Рок праектованай умовы мае быць 20-ці годні.

Праз каждыя 5 гадоў адбываецца перагляд умовы.

Весткі з Расії.

МАСКВА 8 гм. «Вольф». Дзеля перэрвання тэлеграфнай коммунікацыі с Петраградам, весткі аб сытуацыі у Петраградзе даходзяць сюды толькі выпадкова. Кажуць што і там былі страшныя улічныя бітвы паміж большэвікамі і контр-рэвалюцыянэрамі і іщчэ ні скончыліся. Работнікі Пуцілаускаго заводу і больных хвабрык выказаліся проціу саветау.

МАСКВА 9 гм. «Вольф». У Маскве адтрыманы весткі, што спадзеваная ад нескольк дзен забастоука на ж д. пачалася шмат у які мейсцох Расіі.

МАСКВА 8 гм. «Вольф». Прэсса паведамляе: 28 чэрвеня у архангельскім порце высадзілося 10.000 сэрбау і французау. Начальны генэрал апавесьціу, што будзе бараніць место і край «ад Нападу нямецкіх ваенна-палонных». Насяленню розданы спажыучыя прадукты. У Самарскай губ. на жалезьніцах аб'яулен стан аблогі.

У урадавай адозве мяцеж левых с.-р. называецца здушаным.

Масква выглядае ізноу нормальна. Зроблено каля 1000 арэштау. Ж.-д. коммунікацыя перервана.

У кірунку Екацерынбурга і Чэлябінска савецкія войскі пабедна насуваюцца наперад проціу чэхо-словакоу. Тое-ж у кірунку Табольска.

У Кубанскай обласьці казакамі заняты ж.-д. станцыі Веліко-Княжэская і Тарговая,

На беларускім шляху.

— **Пецярбург.** Заложыўся тут «Гурток пазнання Культурна-Прамысловаго стану Беларусі». Гурток приступіу ужо да працы і заняты цяпер апрацаван-

нем пляну работ і састауленням бібліографіі Беларусазнауства. У склад Гуртка уходзюць толькі навуковыя сілы. Старшынёю выбрапы прафэсар Бронісляу Эпімах-Шыпілло, сэкрэтаром інжынер Кляудыш Душэускі.

Адрэс: Піцяр, 4 ліпня № 45, кв. 16. Адрэс бюро: Піцяр, Опочынiна д. № 13, кв. 6.

Адносіны Беларусі да суседніх народау.

«Любіць свой народ, гэто ішчэ ні знача нінавідзець другіх»). С прамовы п. Р. Скірмунта на пасядзэнні Рады Б. Н. Р. 9 ліпня г.г.).

На Беларускай тэрыторыі за увесь час яе гісторыі спатыкаліся рожныя славянскія і ніславянскія народы.

Адбываліся па нашай зямлі бітвы, вёўся гандэль, крыжаваліся культура Заходу і Усхода і кожны с прычастных гэтаму народаў астаўляў тут свой адсьлед і што кольвек пераймаў ад гэтуль.

У свой час абліччо беларускай нацыі,—ўладарніцы гэтай зямлі,—вельмі ярка вызначалася: мовай урадпай, у Бел.—Літоўскім князстві была беларуская; вялікія князі, і выжэйшыя станы гаварылі па беларуску. Беларуская культура мела свой уплыў нават на ніславянскія нацыі: татары друкавалі тут свой коран па беларуску арабскімі літэрамі.

Гісторыя затрымала на час развіцце нашай культуры.

Цяпер зноў будуецца на нашай зямлі беларуская дзержаўнасьць, беларуская асьвядомленая пацыянальная сіла хоча заняць належачае ей мейсцо, і вось адным с першых пытанняў у нас яўляецца адносіны беларускаго народу да жывучых доўгімі гадамі народаў бок о бок з ім. Ні успамінаючы аб старых крыўдах наносяных нам некаторымі з гэтых народаў, як палякамі і вялікарусамі, мы пэўны што з цяперашняй эры гэтаму будзе акрэсована мяжа.

Мы будзем клясыфіцыраваць гэтыя адносіны на 1) ўнешнія і 2) ўнутрэннія.

Да ўнешніх палежыцца устанаўленне граніц з Украінай, с Нольшчай, з Літвою, з Расіяй, экономічныя зносіны з Нямеччынай і з вышэй памянёнымі суседзямі і г. д.

Да ўнутрэнніх—належыцца згрунтаванне добрых прыязьпеных адносін блізкімі суседзямі жывучымі на нашай зямлі. Унутрэннія справы так цесна зьвязаны паміж сабою, што самая аснова гэтаго бытавога укладу меняцца ні можэ, а трэба толькі кіраваць на тое, каб гэтыя самыя уклады прынялі беларуска - дзержаўнае афарбаванне, каб атрофіравалося ўсё анты-беларускае.

Адносіны гэтыя дзелюцца на 1) культурныя і 2) эконамічныя.

Барацьба культур, якая велася проціў беларускай культуры палякамі расійцамі і беларусамі, перайшоўшамі да гэтых станаў, ні можа мець далей мейсца—справа перэвагі будзе тут на старане беларускай дзержаўнай культуры.

Разумецца, пры гэтым павінна быць забезпэчэна магчымасьць развіцця замешканых у нас меншасьцьяў.

З эконамічнаго боку, то да гэтаго часу ажыўленне таргоўляй у нашым краю рабілі жыды і кожны асьвядомлены у гэтым, зразумеіць той плюс, каторы яны давалі краю. І вось пры рэформах у гандлі і хвабрыкацыі у пашым краю—мы пэўны, што адносіны з жыдоўскім элементам, як дагэтуль былі добрыя, такімі-ж будуць і на далей.

Што тычыцца украінцаў і літвіноў, то с прычын падабенства у гістарычным льосу, у традыцыйнай жыццёвай блізасьці і злучнасьці у нас за усё апошняе сталецце вытварылося шчырае спачуванне і такі погляд, што «наша горо —іхняе горо, наша радасьць —іх радасьць».—Разбор нашых спраў будзе між намі болей чым братні.

Беларускім Урадам ужо шмат зроблен оу гэтым кірунку і павінно ішчэ быць зробено.

Мы пэўны, што усе народнасьці жывучыя цесна з намі на нашай зямлі пойдуць нам на сустрэч у нашай джержаўнай будові і ні будуць нам шкодзіць у нашым пацыянальным руху, бо шовінізм у нас мейсца ні мае і мець ні можа. Прыкладаў з другіх па гэтай часьці мы браць ні будзем. Наша ідэя такая, каб у нацыянальным смысле кожны народ быў сам сабою і гэтым ён выпоўне свой прыроднаэтычны доўг.

А што тычыцца тых беларусаў, якія узгадаваліся пад польскай або расійскай культурай, посюць марку першай ці другой нацыі, што мы іх гвалтом у свой лагер ні нацягнем—вольнаму воля.

Я—р.

Уражэнні.

I.

Асталася па заду вялізная старая карчма, якая як воко цыклёпа умясьцілася на развілку двух дарог. Место з яго кіпучым жыццем скончылося. Шырокі шлях бяжыць прад вачыма і прападае недзе у небасхіле за зялёным ўзгоркам.

Абапал дарогі хвалюе высокае жыто і пераліваюцца па ім сьветлозялёныя, нібы зблякавалыя тоны.

— «Добры хлеб павінен сяголета быть! Хопіць яго на бедных і багатых.» Вясёлая думка гэтая дадае мне, замаркоціўшамуся у месьці па новым хлебе чалавеку, энэргіі я ужо ні чую пад сабой зямлі, а нібыто вольна пасуваюся у паветры, хапаючы вачыма распасьцёртую навакол красу.

Вунь па лево за зяленымі хвалямі жыта, якое збегшы у лагчынку пнецца зноў на далёкі узгорак, пад астаткамі высячанаго лесу, шахуецца поле,—гэто роўныя чатырохкутнікі узаранаго парару чаргуюцца з нізенькім аўсом. На правым боку дарогі с паміж старых, густых і высокіх дрэў выглядае страха і шэрыя сьцены нівялічкаго фольварскаго будынку. Вялікае закрытае ценню ад дрэў акно ніжняго паверху відаць так ясно, што пералічыш усе шыбы, хаця да фольварку мусіць ні блізка...

А на перадзі прад вачыма, каля самога небасхілу, хмызнячкі, ляскі, кудзірка, чуць цямнейшай рамкай аколяюць безкрайняе поле...

Часамі на прыдарожным парары убачыш круглабокіх сытых кароў. Яны з смакам жуюць сочпую траву, якая прабілася з зямлі пасьля нідаўніх дажджоў і заўзята адбіваюцца хвастамі ад пазойлівых аваднёў. Маленькі хлопчык—пастушок ляжыць у ніз жыватом на зямлі задраўшы у гару босыя погі. Кудлацеькая, пакрытая старым брылям галоўка апіраецца на пастаўленныя локцямі на зямлю рукі. Блакіт задуманых вочак задзіўлёны у блакіт далёкаго неба.

Пападаюцца ціхія беларускія вёскі. І сапраўды ціхія, бо верныя вартоўнікі гэтых старых, пакрытых ценню ішчэ старэйшых за іх дрэў, хатаў, —вясковыя сабакі, цяпер усе на ланцугу і, зразумеўшы, што вуліца цяпер ні да іх палежыць, маўчаць.

Часамі выгляне з чатырохшыбнаго акна кабета і, абернесся, доўга праваджае цябе зацікаўленымі вачыма. Часамі на прызьбе, з другога канца якой спакойна грабуцца куры, убачыш некалькі жывых, варушачыхся, кінутых на зямлю маковых кветак. Гэто будучыя гаспадынькі і гаспадары аперпшыся ручкамі на зямлю, якой засыпана прызьба і сабраўшыся залатавалосымі галоўкамі у адну кучу, паважна разглядаюць праўдзіўную з'яў-- бронзоваго вялікаго жука, - альбо капаючыся у мяккой прызьбяной зямлі лепяць бабкі.

За вёскай—зноў безкрайняе поле. Ад чыстаго польнаго аромату, ад вольнаго паветра круціцца крыху галава, цесно неяк робіцца у расшыраных грудзях, і толькі ледзь чутны ветрык прагапяе гатовую апанаваць пьянасьць.

І ужо ні толькі зямлі,— сябе ні чую у гэтым родным мне прасторы і забываюся дзе, куды і па што я іду.

Гэто-ж ты, мая Беларусь!

І. Ж.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 11 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Умеранная баевая дзеяльнасьць у працягу дня. Начныя стычкі разведчыкаў. Варожы сільны набег поўночна-усходней Бэтэн адбіты.

Група арміяў Гэрманенаго Кронпрынца.

Ажыўленная агнявая дзеяльнасьць паміж Эн і Марнай. Пачаўшыеся зноў часьцічныя атакі, зробленыя ворагам з боку лесу Вілле-Катэрэ, нашыя пасты адкінулі назад у ушчэлле Сайіер.

Пяць с шасьці самалётау амэрыканскай эскадрыі у паветры папалі у нашыя рукі. Каманда іхняя узята намі у палон.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф**.

Роспуск Беларускай Рады на вакацыі.

На пасядзэнні Беларускай Рады 9, 10 і 11 ліпня паміж іншым былі разгледзены вось якія вельмі важныя пытанні: разгляд дэклярацыі Сэкрэтарыяту Р. Скірмунта і роспуск Рады на летнія канікулы. Пастановай ад 9 ліпня Радай дэкляраныя новаго Сэкрэтарыяту узята да ведама. Другой пастановай Рады ад 11 ліпня Рада распускаецца на 2 месяцы да 15-го верэсьня на летнія вакацыі. Склікание Рады пасьля прынятаго сроку павінна быць па наказу. У выпадку надзвычайных варункаў прэзыдыуму дано права склікаць Раду і раней зацьверджанаго сроку.

Склад Сэкрэтарыяту п. Р. Скірмунт вось які: Р. Скірмунт—старшыня сэкрэтарыяту і Сэкрэтар міжнародных спраў, Кондратовіч—сэкрэтар ўнутрэнніх спраў, С.. Хржонстоўскі—Сэкрэтар фінансаў, Р. Остроўскі—Сэкрэтар асьветы і П. Алексюк—загадчык справамі.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Пастановаю Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 11 ліпня гэтаго 1918 году сэссія Рады запынена дзеля летняго адпачынку да 15 верасьня гэтаго-ж 1918 году.

Глаоуны маршалак Я. Ліосік.
Пісар С. Ленкоускі.

Епархіяльны зьезд духавенства чацьвертаго дня афіцыяльна разрэшан нямецкімі уласьцямі у жніуні мес.

Дзержауныя і земскія зборы, пошліны і нідаімкі, як апавешчае глаунакамандуючы X арміяй, у яе районі узысківаюцца на законных асновах, прычым іх ужываюць на расходы па упрауленню краем і на яго установы.

Прауленне хауруса землеуласьнікау, з мэтай усьпешнаго паступлення гасуд. і земскіх зборау, прапануе як найхутчэй унесьці прасрочаныя падаткі, дзеля наладжэння кепскіх фінансавых спрау краю, на аснові апавечання глаунай кватэры глаунакамандуючаго X арміяй ад 7-го ліпня.

Кватэрныя цэны, у цэнтральнай часьці места, хутка падняліся да 300%, є прычын раскватэравання штабу X арміі

Праверка бонавых кніжак ва усіх 5-ці бонавых буро, згод на абвесткі месьскай харчовай камісыі, адбудзецца 12, 13, 14 15, 16 і 17 ліпня.

Пасьля гэтага срока на не правераных кніжкам одпус прадуктау спыняецца.

Чародны одпуск цукравога пяску (2 ф.), сярнічак—1 пудэлка і солі—1 фунт пачнецца ва усіх крамах ад нядзелі, 14 —ліпня.

Мейсцамі пачауся 11-го ліпня

Эксплоатацыйны кадр служачых, выдзелены, па загаду нямецкіх уласьцей, з упрауленскай канторай службы цягі Л. Р. ж. д., павялічываецца ад 25-ці да 50-ці.

Тое самое, пэуне, будзе і другіх службах.

Налогавыя кассы пры земскі управах, па загаду нямецкі уласьцей, спыняюцца. Налогі павінні быць унесены у казначэйствы.

У губэрнскім прысуцтвіі чарговае судзебнае пасядзэнн адбудзецца 17 ліпня. Назначано да слуханя 100 грамадзянскіх спрау.

Выпуск унутрэнняй пазы на $2\frac{1}{2}$ мільена руб. 6% н 5 гадоу мае быць разрэшан нямецкімі уласьцямі, —замест месьскіх бон, якія прапанаваліс раней.

С прычын сьвята сьв. апостолау Петра і Паула сягоня у Крупцах (5 верст ад места —прэстольнае сьвято і вялік як зауседы, зьезд месьскіх жыхароу і парахвіяльных селян.

Цэны на хлеб у вольнай прадажы усе павялічываюцца —дайшло у апошнія дні д 3 р. 20 к.—3 р. 50 к. за фунт.
Масло кароуе—12 р. фунт.
Сыры—3—$3\frac{1}{2}$ р. ф.

Хлебны паек ад учорайшаг дня на другую палову гэтаг тыдня выдаецца па 1 фунт на порцыю.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.